# Пад небам Песняра



Зінаіда КАМАРОЎСКАЯ, дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа

**Паўнавартаснае грамадска-культурнае жыццё нашай краіны сёння цяжка ўявіць без творчых здабыткаў аднаго з пачынальнікаў беларускай літаратуры народнага паэта Якуба Коласа. Чаго толькі вартыя яго ўлюбёна-песенная «Новая зямля», лірычна-лагодны «Сымон-музыка», алегарычна-ўдумлівыя «Казкі жыцця» і многія іншыя творы, якія з'яўляюцца нашым нацыянальным гонарам і агульнай духоўнай скарбніцай...**
**Аднак асабліва прыцягальнымі для многіх з нас сталі імя і справы Якуба Коласа сёлета, калі адзначаецца 130-годдзе з дня яго нараджэння. Пра тое, як Беларусь ушаноўвае свайго Песняра, «Беларускай думцы» расказвае дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Зінаіда КАМАРОЎСКАЯ.**

**– Зінаіда Мікалаеўна, напэўна, не будзе перабольшаннем сцверджанне, што музейная ўстанова, якую Вы ўзначальваеце, з'яўляецца асноўным цэнтрам і галоўным каардынатарам мерапрыемстваў з нагоды 130-годдзя з дня нараджэння Песняра. Гэта не толькі ганаровая, але і адказная місія. Як спраўляецца з ёю калектыў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа?**

– Як вядома, яшчэ год таму, 25 кастрычніка 2011 года, Прэзідэнтам быў падпісаны Указ «Аб мерапрыемствах, прысвечаных 130-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа», які зацвердзіў склад рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта па святкаванні юбілеяў класікаў на чале з намеснікам прэм'ер-міністра Анатолем Тозікам і план мерапрыемстваў, прысвечаных гэтым дзвюм памятным датам. Гэты дакумент стаў новым імпульсам для той вялікай работы, якая была праведзена і праводзіцца па ўшанаванні ў нашай краіне і за яе межамі памяці Якуба Коласа і Янкі Купалы.

Што ж тычыцца Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа, то яго калектыў прымаў і прымае ва ўсіх намечаных прэзідэнцкім указам мерапрыемствах актыўны ўдзел. Гэта і спрыянне ў наладжванні выстаў, прадастаўленне матэрыялаў для выдання прэзентацыйных альбомаў, кніг і стварэння фільмаў, прысвечаных жыццю і творчасці Песняра, наладжванне тэматычных вечарын, паэтычных чытанняў, канферэнцый, конкурсаў і г.д. Акрамя гэтага, Коласаў музей прытрымліваецца і свайго рабочага плана, які ўключае шмат як традыцыйных для нас, так і новых мерапрыемстваў.

**– І якія з іх Вы найперш бы вылучылі?**

– Пачну, відаць, з нашых задум, непасрэдна прымеркаваных да 130-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа. Гэта – конкурс на лепшы літаратурны праект «130 прысвячэнняў Песняру». Мы абвясцілі яго ў пачатку вясны і планавалі завяршыць у канцы лета, аднак вымушаны былі перанесці тэрмін падвядзення вынікаў, бо жадаючых прыняць у ім удзел аказалася шмат. Нам сталі прысылаць не толькі арыгінальныя аматарскія творы, прысвечаныя Якубу Коласу ці яго літаратурным героям, але і лісты з просьбамі прадоўжыць гэты конкурс. Таму і вырашана было падвесці вынікі нашай акцыі на пачатку лістапада, напярэдадні дня нараджэння Песняра, больш таго, і выдаць

НАША ДАСЬЕ

КАМАРОЎСКАЯ Зінаіда Мікалаеўна.

Нарадзілася ў вёсцы Заямнае Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці. Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1974).
У 1975–1985 гадах працавала ў Літаратурным музеі Янкі Купалы, у 1985–1987 гадах – у Мінскім абласным камітэце прафсаюза работнікаў культуры. З 1987 года – дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа.
Аўтар шэрагу навуковых публікацый па пытаннях Коласазнаўства.

лепшыя творы ўдзельнікаў конкурсу ў спецыяльным зборніку.

У рамках юбілейнага года ў нашым музеі вялікую папулярнасць атрымала і яшчэ адна грамадская акцыя «Мы чытаем Коласа», мэта якой – папулярызацыя твораў славутага паэта. Праходзіць яна ў выглядзе тэматычных вечарын-сустрэч з вядомымі людзьмі, грамадскімі дзеячамі, прадстаўнікамі міністэрстваў і ведамстваў, супрацоўнікамі газет і часопісаў, завяршаюцца якія чытаннем твораў Песняра. Прынамсі, нашымі гасцямі былі ўжо супрацоўнікі газеты «Звязда», часопісаў «Роднае слова», «Вясёлка», «Алеся», беларускія навукоўцы-мовазнаўцы, якія, акрамя таго, перадалі ў фонд музея аўтарэфераты сваіх дысертацый, прысвечаных даследаванню жыцця і творчасці Якуба Коласа, а таксама члены Дабрачыннага савета Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа, народныя артысты Беларусі Таццяна Мархель, Генадзь Аўсяннікаў, Марыя Захарэвіч, Генадзь Гарбук, заслужаная артыстка Беларусі Ірына Дарафеева, трохразовая чэмпіёнка Параалімпійскіх гульняў Вольга Зінкевіч... Плануецца, што гэта акцыя будзе прадоўжана і на будучы год.

Цікава прайшла і ўрачыстасць, прысвечаная 100-годдзю з дня першай сустрэчы Якуба Коласа і Янкі Купалы. Адбылася яна ў пачатку жніўня ў філіяле нашага музея на Стаўбцоўшчыне, дзе на хутары Смольня непадалёк ад Мікалаеўшчыны, на сядзібе родных Коласа, і пазнаёміліся пісьменнікі. Спецыяльна да гэтага мерапрыемства была падрыхтавана выстава з фондаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа і Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы пад назвай «Шляхам Янкі Купалы да Якуба Коласа». Дарэчы, летась у Смольні быў закладзены сквер «Дрэва жыцця» з 57 дрэўцаў, прывезеных з родных мясцін вядомых пісьменнікаў Беларусі і Расіі, у тым ліку і з купалаўскай Вязынкі, пушкінскага Міхайлаўскага, лермантаўскіх Тарханаў...



Якуб Колас. 1950-я гады

**– Ведаю, што неад'емнай часткай дзейнасці музея па папулярызацыі творчай спадчыны народнага Песняра з'яўляецца навукова-практычная канферэнцыя «Каласавіны» і аднайменнае літаратурна-мастацкае свята на радзіме Якуба Коласа, якое традыцыйна праходзіць у дзень нараджэння паэта – 3 лістапада...**

– Сёння «Каласавіны» – больш як традыцыя. Гэта ўжо заканамерная падзея-неабходнасць, якая заўсёды пакідае добры след у памяці прыхільнікаў творчасці народнага паэта. Мы іх кожны год чакаем з нецярплівасцю. Для нас гэта асаблівы дзень, калі ў Коласаў дом прыязджае шмат шаноўных гасцей – даследчыкаў творчасці паэта і заўзятых прыхільнікаў яго таленту. Прычым не толькі з Беларусі, але і з блізкага і далёкага замежжа. Сёлета, напрыклад, коласазнаўцы сустрэнуцца ў нас і падзеляцца сваімі навуковымі даследаваннямі ўжо 27-ы раз.

Штогод па выніках «Каласавін» наш музей выдае зборнікі навуковых матэрыялаў. Іх ужо дваццаць шэсць, а 27-мі стануць на будучы год матэрыялы «Каласавін-2012». Дарэчы, плануецца, што ў сёлетняй навукова-практычнай канферэнцыі прымуць удзел больш як 60 чалавек, у т.л. з Украіны, Літвы і Расіі – літаратуразнаўцы, пісьменнікі, архівісты, журналісты, даследчыкі літаратурных сувязей Якуба Коласа. Яны раскажуць калегам і аднадумцам пра вынікі сваіх творчых пошукаў, выкажуць погляды на асвятленне таго ці іншага пытання далёка яшчэ да канца не вывучанага жыццёвага і творчага шляху Песняра.

Значны вопыт правядзення літаратурна-мастацкага свята «Каласавіны» з сярэдзіны 1980-х гадоў быў назапашаны нашым музеем на маёй роднай Стаўбцоўшчыне, радзіме народнага Песняра. Дзякуючы няўрымслівасці вялікага энтузіяста-коласаўца, колішняга начальніка аддзела культуры Стаўбцоўскага райвыканкама Анатоля Васільевіча Грэкава, а зараз старшыні Дабрачыннага савета пры Коласавым музеі

нашы сумесныя мерапрыемствы не толькі прыўносілі шматлікія станоўчыя адценні ў палітру культурнага жыцця рэгіёна, але і пакідалі пасля сябе прыкметны след.

Нязменным правілам стаўбцоўскіх «Каласавін» быў удзел у іх прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі краіны: пісьменнікаў і паэтаў, артыстаў, мастакоў, супрацоўнікаў вядучых музеяў, навукоўцаў і лепшых мастацкіх калектываў Стаўбцоўшчыны. Адрасамі правядзення свята ў абавязковым парадку станавіліся Акінчыцы, Альбуць, Ласток, Смольня – мемарыяльныя сядзібы філіяла Коласавага музея і вёска Мікалаеўшчына, дзе ўстаноўлены помнік народнаму паэту. На час «Каласавін» кожная з музейных сядзіб ператваралася ў невялікую сцэнічную пляцоўку, на якой выступалі мастацкія калектывы з устаноў культуры раёна. Адметнасць іх рэпертуару – народныя песні, у тым ліку і запісаныя на Стаўбцоўшчыне, а таксама музычныя і вакальныя творы, створаныя паводле вершаў Я. Коласа. Там жа праходзілі і творчыя сустрэчы з пісьменнікамі і паэтамі. У розныя гады гасцямі «Каласавін» былі народныя пісьменнікі Янка Брыль, Іван Шамякін, паэты Сяргей Грахоўскі, Мікола Мятліцкі, Анатоль Вярцінскі, Навум Гальпяровіч, мастак Уладзімір Сулкоўскі і іншыя. Заўсёды ў гэтым свяце ўдзельнічалі і пісьменнікі-землякі Генрых Далідовіч, Мікола Маляўка, Казімір Камейша, Алесь Рыбак, Алесь Камароўскі, Яўген Хвалей, Уладзімір Мархель. А творчую кампанію ім складалі члены раённага літаратурнага аб'яднання «Аўтограф».

Пакінулі пасля сябе «Каласавіны» і візуальную памяць. Штогод спецыяльна да іх прымяркоўвалася якая-небудзь адметная ўрачыстасць з нагоды ўвекавечання гістарычнай мясціны альбо памяці вядомых людзей, ураджэнцаў Стаўбцоўшчыны.

Менавіта ў рамках «Каласавін» адбылося ўвекавечанне памятных мясцін, звязаных з жыццём і творчасцю Песняра на яго малой радзіме. У гэтым шэрагу ўрачыстае адкрыццё мастацка-мемарыяльнага комплексу драўляных скульптур «Шлях Коласа» – адметнага помніка ў дрэве героям твораў Якуба Коласа. Фігуры ўстаноўлены ўздоўж дарог, што вядуць у родныя мясціны народнага паэта: з Акінчыц у Мікалаеўшчыну, у Альбуць, а таксама ва ўрочышчы Бервянец ля турыстычнай базы «Высокі бераг». Над стварэннем скульптур у свой час працавалі лепшыя рэзчыкі па дрэве нашай краіны, і іх работы сёння радуюць не толькі прыхільнікаў таленту Я. Коласа, але і ўсіх падарожнікаў па радзіме народнага паэта.

Таксама да «Каласавін» было прымеркавана адкрыццё мемарыяльнага знака на маляўнічым беразе Нёмана ва ўрочышчы Пристанька, дзе прайшоў першы нелегальны з'езд настаўнікаў Мінскай губерні, удзельнікам і адным з арганізатараў якога быў Якуб Колас. Памятны знак з'явіўся таксама на месцы былой леснічоўкі ў Цёмных Лядах, дзе ў свой час жыў народны паэт у свайго брата Уладзіміра і дзе ім была адкрыта нелегальная школа, у якой ён навучаў дзяцей з бліжэйшых вёсак беларускай мове. Вынікам адных з чарговых «Каласавін» стала пазнака на мясцовасці (быў устаноўлены арыгінальны ўказальнік) Чортавага каменя – помніка прыроды, які



Экспазіцыя «Раніца ў нядзельку» мастацка-мемарыяльнага комплексу «Шлях Коласа»

з'яўляецца «галоўным героем» аднайменнага апавядання Я. Коласа і які па неахайнасці дарожных службаў у сярэдзіне 70-х гадоў мінулага стагоддзя аказаўся прысыпаны зямлёй.

З часам, пашыраючы свой дыяпазон, «Каласавіны» перайшлі і межы роднага кута Песняра. З мэтай папулярызацыі творчасці паэта і культурнай спадчыны раёна ў розныя гады да свята далучаліся і іншыя мясцовасці. Так, у яго рамках мемарыяльным знакам на месцы колішняга фальварка Залучча была ўвекавечана памяць пра польска-беларускага паэта і краязнаўца

Уладзіслава Сыракомлю, чый літаратурны талент праявіўся менавіта на Стаўбцоўскай зямлі. Такі ж мемарыяльны камень-валун быў устаноўлены і ў вёсцы Мархачоўшчына, дзе ў сярэдзіне XIX стагоддзя жылі паэты Янка Лучына і той жа У. Сыракомля. А на будынку Стаўбцоўскай гімназіі з'явілася мемарыяльная шыльда з нагоды таго, што ў пачатку XX стагоддзя ў чатырохкласным гарадскім вучылішчы ў Стоўбцах навучаўся будучы народны паэт Беларусі Кандрат Крапіва. У вёсцы Засулле, дзе прайшлі дзіцячыя гады пісьменніка і грамадскага дзеяча пачатку мінулага стагоддзя Каруся Каганца, і па сёння адной з мясцовых адметнасцей з'яўляецца мемарыяльны знак, прысвечаны гэтаму чалавеку. Адкрыццё «Каменя славутасцей» у вёсцы Жукаў Барок як уганараванне таго, што ў розныя гады там жылі і чэрпалі натхненне пісьменнік Адам Плуг, паэт Уладзіслаў Сыракомля, філосаф Саламон Майман, псіхолаг і педагог Юзэфа Кодзіс, – таксама вынік «Каласавін». У гэты шэраг трэба аднесці і вёску Налібакі, дзе нарадзіўся літаратуразнавец і акцёр Юзюк Фарботка, памяць пра якога таксама засведчана мемарыяльным знакам, і вёску Ручына, дзе ўстаноўлены памятны камень з надпісам, што там жылі продкі яшчэ аднаго нашага нацыянальнага класіка Янкі Купалы...

Да адметных здабыткаў «Каласавін» трэба дадаць і з'яўленне чатырох невялікіх зборнікаў «Народных песень радзімы Якуба Коласа», выдадзеных аддзелам культуры Стаўбцоўскага райвыканкама ў 1994, 1995, 1998 і 2002 гадах. А ўключаны ў іх былі песні, запісаныя работнікамі ўстаноў культуры раёна ў старажылаў мясцовых вёсак.

У апошнія два гады супрацоўніцтва нашага музея з культурным ведамствам Стаўбцоўшчыны не мае такога шырокага размаху, аб чым даводзіцца толькі шкадаваць.

**– ...І няўжо няма шанцаў на аднаўленне ранейшых сувязей?**

– Спадзяюся, што гэта не так. Бо кіраўніцтва Стаўбцоўшчыны, і ў прыватнасці старшыня мясцовага райвыканкама Уладзімір Трафімавіч Місько, заўсёды стараецца дапамагчы размешчанаму на тэрыторыі раёна філіялу нашага музея. Вось і сёлета раён на бязвыплатнай аснове паспрыяў нам у замене парканаў на мемарыяльных сядзібах, у рамонце нашых музейных аб'ектаў, добраўпарадкаванні тэрыторыі вакол іх, за што выказваем вялікую падзяку.



Акінчыцы – месца нараджэння народнага паэта Беларусі Якуба Коласа

**– А што ўяўляе сабой сёння філіял Коласавага музея на Стаўбцоўшчыне?**

– Гэты жывапісны куточак Наднямоння аб'ядноўвае чатыры мемарыяльныя сядзібы нашага музея – «Смольня», «Акінчыцы», «Альбуць» і «Ласток», кожная з якіх мае сваю адметнасць і непаўторнае аблічча.

Акінчыцы – месца нараджэння народнага паэта Беларусі Якуба Коласа. У мінулым гэта быў засценак, потым вёска, якая рашэннем Мінскага аблвыканкама ў 1977 годзе ўключана ў межы горада Стоўбцы. У 1982 годзе, да 100-годдзя з дня нараджэння Песняра, згодна з архіўнымі дакументамі тут была адноўлена сядзіба лесніка, якім, як вядома, быў бацька паэта: хата ў гладкі вугал, крытая гонтай, з трыма вокнамі, гумно з аборай пад саламянай страхою, студня з жураўлём, прыгрэбнік, паркан з хваёвых плашчакоў, закладзеных у шулы. Інтэр'ер акінчыцкай сядзібы адноўлены паводле ўспамінаў родзічаў Песняра, а размешчаная там экспазіцыя расказвае пра побыт сям'і Міцкевічаў.

Леснікова пасада ва ўрочышчы Ласток аказалася ў 1885 годзе чарговым месцам службы радзівілаўскага лесніка Міхала Міцкевіча. Тут сям'я будучага паэта жыла да вясны 1890 года. Сярод усіх мемарыяльных сядзібаў нашага музея менавіта Ласток мае на сённяшні дзень найбольшую каштоўнасць. Бо ён захаваў свой першапа-

чатковы выгляд – хата і гумно, пабудаваныя ў 1885 годзе, з'яўляюцца сведкамі ранніх дзіцячых гадоў Якуба Коласа. У 1997 годзе там была адкрыта экспазіцыя паводле матываў паэмы «Сымон-музыка».

З Ластка бацьку Якуба Коласа перавялі ў леснічоўку ў Альбуці, дзе Міцкевічы ўжо затрымаліся на значна большы тэрмін, да 1902 года. Незабыўныя малюнкі навакольнага ляснога харастава якраз і сталі тым падмуркам, на якім затым вырастаў і мацнеў талент будучага паэта. У Альбуці Костусь Міцкевіч навучыўся чытаць, адсюль хадзіў у народнае вучылішча ў вёску Мікалаеўшчына, менавіта тут ён напісаў свой першы верш. Тамтэйшыя мясціны пазней паэт уславіў у многіх сваіх творах і найперш у геніяльнай «Новай зямлі», дзе Альбуць апісана як Парэчча.

У 1990 годзе ў адноўленай у Альбуці лесніcоўцы была створана літаратурна-мемарыяльная экспазіцыя паводле матываў паэмы «Новая зямля». Тут можна даведацца аб прататыпах герояў твора, азнаёміцца з рукапісамі і выданнямі паэмы, прадметамі побыту сялян XIX–XX стагоддзяў. Лагічным тэматычным працягам альбуцкай экспазіцыі з'яўляецца і выстава «Пчалярства і рыбалоўства», размешчаная ў таксама аднoўленым гумне.

Смольня – гэта своеасаблівы літаратурна-мемарыяльны комплекс, які ўключае былую сядзібу родных Якуба Коласа і сучасны двухпавярховы будынак літаратурнай экспазіцыі. Мемарыяльная хата, дзе доўгі час жыў брат паэта Іосіф Міцкевіч з сям'ёй, была музеефікавана да 90-годдзя з дня нараджэння Песняра ў 1972 годзе. Літаратурная ж частка знаёміць з дзіцячымі і юнацкімі гадамі паэта, далейшым яго жыццёвым і творчым шляхам. У Смольні Якуб Колас жыў наездамі ў 1911–1914 гадах (нагадаем, у жніўні 1912 года тут адбылася яго першая сустрэча з Янкам Купалам), бываў тут у 1940 годзе і пасля Вялікай Айчыннай вайны ў 1946–1952 гадах. Апошні раз Якуб Колас наведаў гэтую мясціну 30 красавіка 1956 года, незадоўга да сваёй смерці. У Смольні ў розныя гады паэт працаваў над паэмамі «Новая зямля» і «Сымон-музыка», тут ён напісаў шэраг вершаў і апавяданняў, сядзіба адлюстравана і ў яго аўтабіяграфічнай трылогіі «На ростанях».

**– А на якім узроўні праведзена музеефікацыя іншых мясцін, звязаных з жыццём і творчасцю Якуба Коласа?**

– Адразу трэба зазначыць, што з усіх памятных месцаў, звязаных з жыццём і творчасцю Песняра, а іх на тэрыторыі Беларусі з добрых тры дзясяткі, непасрэдна, скажам так, падпарадкаваны нашаму музею толькі пералічаныя вышэй мемарыяльныя сядзібы, размешчаныя на Стаўбцоўшчыне. Усе іншыя маюць розную адміністрацыйную прапіску, але ва ўсіх галоўная задача – беражліва захоўваць і папулярызаваць Коласаву спадчыну.

Вельмі многае зроблена ў гэтым плане на Пухаўшчыне. Маляўнічае лясное наваколле гэтага рэгіёна сучаснай Міншчыны прыглянулася Якубу Коласу на пачатку 30-х гадоў мінулага стагоддзя, калі ў паэта і яго сям'і ўзнікла неабходнасць летняга адпачынку на ўлонні прыроды. Родны кут Песняра на Стаўбцоўшчыне ў той час быў для яго недасягальны, бо ў складзе заходнебеларускіх



Экспазіцыя ў літаратурна-мемарыяльным комплексе «Смольня»

тэрыторый належаў Польшчы. Пухавіцкія мясціны нагадвалі народнаму паэту яго радзіму, таму Я. Колас год ад году рэгулярна прыязджаў туды на адпачынак практычна да канца сваіх дзён. Ён праводзіў летні час у некалькіх населеных пунктах раёна – у Тальцы, Загібельцы, Падбярэжжы, Вусці, Забалацці, Беразянцы, Балачанцы. Якраз у гэтых мясцінах ён пачаў працу над паэмай «Рыбакова хата», заканчваў апошнія раздзелы трылогіі «На ростанях», плённа працаваў на паэтычнай ніве...

Шмат якія старонкі літаратурнай дзейнасці Песняра на Пухаўшчыне і звязанага з тамтэйшымі мясцінамі яго жыццяпісу раскрывае экспазіцыя Пухавіцкага раённага краязнаўчага музея пад назвай «Якуб Колас: прырода і людзі роднага краю». Памяць пра знаходжанне народнага паэта ўвекавечана мемарыяльнымі шыльдамі і знакамі на будынку чыгуначнага вакзала ў Тальцы, а таксама ў вёсках Падбярэжжа, Балачанка, на месцы былога хутара Загібелька. Пра прыезд і знаходжанне ў Мар'інай Горцы адразу двух нацыянальных класікаў Якуба Коласа і Янкі Купалы сведчыць і памятная дошка на будынку абласнога дзіцячага медыцынскага рэабілітацыйнага цэнтра – колішняга Дома творчасці пісьменнікаў «Пухавічы».

Коласаўскія старонкі можна адшукаць і ў Пінску, на Ганцаўшчыне, Лунінеччыне, Смалявіччыне... На працягу двух апошніх гадоў нашым музеем была праведзена адметная выставачная акцыя, прысвечаная творчым і жыццёвым сувязям Песняра з канкрэтнымі рэгіёнамі. У вядучых музеях кожнага з абласных цэнтраў мы стварылі тэматычныя выставы, якія дапаўняліся мясцовымі матэрыяламі, звязанымі з жыццяпісам Якуба Коласа. Тая акцыя мела поспех і спадахвоціла нас «апусціцца» на раённы ўзровень, і гэтая работа ў нас наперадзе.

Існуе шмат тэматычных раздзелаў, прысвечаных Якубу Коласу, у школьных літаратурных і краязнаўча-этнаграфічных музеях. З многімі мы падтрымліваем сувязь, па іх просьбах дзелімся копіямі матэрыялаў, праводзім сумесныя выставы, літаратурныя вечарыны і сустрэчы. Дарэчы, кіраўнікі гэтых сяброўскіх для нас музеяў запрошаны на сёлетнія «Каласавіны», і мы разам з імі плануем за круглым сталом абмеркаваць найбольш цікавыя аспекты коласазнаўчай работы ў рэгіёнах і намеціць перспектывы для паглыблення нашага супрацоўніцтва.

**– Не магу не спытацца і пра сённяшні стан спраў па папулярызацыі імя Якуба Коласа за мяжой. У прыватнасці, ва Узбекістане, дзе Песняру давялося жыць у эвакуацыі ў Вялікую Айчынную вайну.**

– Як вядома, сонечны Ташкент гасцінна прыняў сям'ю Якуба Коласа ў ваенным жніўні 1941-га. А пакінуў беларускі Пясняр узбекскую сталіцу, дзе стварыў больш за 60 паэтычных твораў, пісаў публіцыстычныя артыкулы, рабіў накіды рамана пра беларускіх партызан, які так і не быў напісаны, на пачатку лістапада 1943 года. Паэт быў у захапленні ад маляўнічай горнай прыроды, часта наведваў курортны пасёлак каля гары Чымган, якую апеў у аднайменным вершы.



Я. Колас, рускі паэт і перакладчык С. Гарадзецкі, беларуская паэтэса Э. Агняцвет (першы рад, справа налева) на святочным пасяджэнні, прысвечаным 60-годдзю Я. Коласа, г. Ташкент. 2 лістапада 1942 года

Акрамя літаратурнай працы, Я. Колас як віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук Беларускай ССР, а таксама член Усеславянскага камітэта вёў у Ташкенце і вялікую грамадскую дзейнасць, наведваў Саюз пісьменнікаў Узбекістана, рэдакцыі газет і часопісаў, вайсковыя часці мясцовага гарнізона, дзе адбываліся літаратурныя сустрэчы з яго ўдзелам. У ташкенцкім Доме Чырвонай арміі 3 лістапада 1942 года прайшло ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае 60-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа.

Нядаўна нашым супрацоўнікам удалося натрапіць на цікавыя звесткі з ташкенцкага жыццёвага перыяду Песняра. Так, у сваім лісце ў ЦК Кампартыі Узбекістана паэт як дэпутат Вярхоўнага Савета СССР хадайнічаў пра аказанне дапамогі нашчадкам вялікага рускага паэта А.С. Пушкіна. У прыватнасці, ён даводзіў, што ў Ташкенце ў пастаяннай нястачы жыве жанчына па прозвішчы Красоўская (у дзявоцтве Ганібал), яе 23-гадовы сын вельмі таленавіты мастак, і добра было б, каб на яго звярнулі ўвагу. Як склаўся лёс гэтых людзей і ці дапамагла ім просьба Я. Коласа, патрэбна яшчэ высвеліць.

Ёсць звесткі і пра тое, што народны паэт Беларусі спрыяў і падтрымліваў матэрыяльна Ганну Ахматаву, якая таксама ў ваенны час жыла ў Ташкенце. Паводле ўспамінаў малодшага сына Песняра Міхася Канстанцінавіча Міцкевіча, паэт перасылаў ёй грошы праз Саюз пісьменнікаў Узбекістана.

За савецкім часам у Ташкенце было зроблена многае па ўвекавечанні памяці Якуба Коласа. Адна з вуліц узбекскай сталіцы насіла яго імя, на доме, дзе жыў паэт, у 1960 годзе была ўстаноўлена мемарыяльная дошка з адпаведным надпісам на трох мовах: узбекскай, беларускай і рускай. Аднак, паводле звестак, якія мы маем, зараз у Ташкенце няма вуліцы Якуба Коласа, на жаль, не ведаем мы і пра тое, ці захавалася мемарыяльная дошка ў яго гонар. Пакуль што нам не ўдалося наладзіць кантакты з узбекскімі музейшчыкамі і культурнымі ведамствамі гэтай краіны.

Затое радасныя весткі мы атрымалі на пачатку гэтага года з расійскай Куршчыны, дзе ў былым павятовым горадзе Абаянь і навакольных з ім вёсках народны Пясняр настаўнічаў і, больш таго, быў адным з арганізатараў устаноў савецкай народнай асветы ў 1917–1921 гадах. Гэты перыяд пакінуў значны адбітак у яго творчасці. Нягледзячы на напружаную працу на настаўніцкай ніве, на Куршчыне паэт напісаў каля 20 вершаў, плённа працаваў над паэмамі «Сымон-музыка» і «Новая зямля», там з-пад яго пяра выйшлі хрэстаматыйныя апавяданні «Чортаў камень» і «Стары лес» з цыкла «Казкі жыцця», нарыс «З румынскага фронту». Дык вось, нядаўна ў Літаратурным музеі горада Курска быў адкрыты раздзел, прысвечаны Якубу Коласу. Ёсць матэрыялы пра беларускага Песняра і ў музеі адной са школ Абаянскага раёна.

Дарэчы, дырэктар Літаратурнага музея горада Курска Валянціна Грыгаржэвіч нядаўна гасціла ў нас, была ўдзельніцай Міжнароднага круглага стала кіраўнікоў мемарыяльных літаратурных музеяў Беларусі, Літвы, Расіі і Украіны, што ў жніўні праводзіўся на базе Коласавага дома. Чакаем яе і на «Каласавінах», падчас якіх плануецца падпісанне дамовы аб супрацоўніцтве нашых музейных устаноў. Прыемна і тое, што нашы курскія калегі падтрымалі прапанову па наданні адной з вуліц свайго абласнога цэнтра імя Якуба Коласа. Спадзяёмся, што з іх дапамогай гэта задума ажыццявіцца менавіта ў час урачыстасцей з нагоды 130-гадовага юбілею Песняра.

**– А з якімі іншымі замежнымі музеямі ў Коласавага дома наладжана супрацоўніцтва?**

– З 2005 года доўжыцца наша творчая садружнасць з Кіеўскім літаратурна-мемарыяльным музеем Максіма Рыльскага. Яе вынікам стаў цэлы шэраг агульных мерапрыемстваў і сустрэч: святкаванне 40-годдзя заснавання музея М. Рыльскага і 115-годдзя з дня нараджэння ўкраінскага паэта, з якім Якуба Коласа звязвала цесная дружба, штогадовы ўдзел украінскіх калег у «Каласавінах», сумесная пошукава-фондавая работа ў музейных архівах. Вось і нядаўна супрацоўнікі Коласавага дома гасцілі ў кіяўлянаў, прымалі ўдзел у традыцыйным літаратурна-мастацкім свяце «Галасееўская восень», дзе прэзентавалі фотавыставу, прысвечаную беларускаму Песняру.



Будынак Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа

Летась намі было заключана пагадненне аб супрацоўніцтве з Дзяржаўным мемарыяльным гісторыка-літаратурным і прыродна-ландшафтным музеем-запаведнікам А.С. Пушкіна «Міхайлаўскае» (так званы «Пушкінскі запаведнік»). І ўжо ёсць першыя вынікі нашага творчага пабрацімства. «Пушкінская выстава» ў канцы мінулага года экспанавалася ў нас, а ў «Міхайлаўскім» вясной гэтага годы мы сумесна з калегамі з Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы прэзентавалі выставу, прымерка-

ваную да 130-годдзя з дня нараджэння двух беларускіх песняроў.

Таксама ў мінулым годзе на афіцыйным узроўні мы аформілі свае даўнія адносіны з вільнюскім Літаратурным музеем Аляксандра Пушкіна. Нашы калегі з пушкінскага музея сталіцы Літвы сёння з'яўляюцца надзейнымі партнёрамі ў справе папулярызацыі імя Якуба Коласа ў краіне-суседцы, з якой народны паэт Беларусі меў вельмі цесныя стасункі. Менавіта з іх дапамогай мы нядаўна расшукалі такі вось цікавы факт.

Як вядома, на паўночным усходзе літоўскай сталіцы ў гістарычным раёне Павільнюс знаходзіўся дом жонкі народнага паэта Беларусі Якуба Коласа Марыі Дзмітрыеўны Каменскай. У 20-х гадах мінулага стагоддзя яна перадала яго брату. А ўжо ў пачатку 60-х гадоў згодна з адпаведнай пастановай урада Літоўскай ССР у ім планавалася стварыць музей Я. Коласа. Аднак атрымалася няўвязка – праекціроўшчыкі зрабілі заключэнне, што драўляны дом Каменскіх нельга захаваць, бо яго моцна пашкодзіў грыбок, і справу, як кажуць, спусцілі на тармазах. Дом разабралі, а ўсё начынне, якое было ў будынку, – сталы, шафы, шмат мастацкіх работ, перадалі Літаратурнаму музею А. Пушкіна. Калі мы паднялі акты перадачы гэтых рэчаў, то выявілі, што іх падпісваў «дырэктар музея Я. Коласа ў г. Вільнюсе». Дык выходзіць, што Коласаўскі музей у Вільнюсе ўсё ж існаваў, хоць і на паперы.

Прыемна, што некалькі гадоў таму вільнюская беларуская дыяспара паклапацілася аб заснаванні грамадскага аб'яднання «Культурны цэнтр імя Якуба Коласа ў Вільні», якое падтрымлівае сувязі з нашым музеем. Не можа не радаваць і апошняя навіна, якую агучыў у канцы верасня падчас правядзення Дзён культуры Беларусі ў Літве міністр культуры Павел Латушка: у гэтым годзе ў Вільнюсе будзе ўстаноўлена памятная дошка, прысвечаная Якубу Коласу.

Мы таксама разлічваем і на вялікі творчы вынік ад наладжвання сувязей з ужо згаданым вышэй Літаратурным музеем горада Курска і з Дзяржаўным Лермантаўскім музеем-запаведнікам «Тарханы». З апошнім мы таксама плануем у бліжэйшы час падпісаць пагадненне аб супрацоўніцтве, а першым крокам у гэтым напрамку стаў абмен выставамі сёлетняй вясной. Нашы расійскія калегі прэзентавалі ў Мінску выставу работ фотамастака В. Івашчанкі «Навокал усё родныя мясціны...», на якой былі прадстаўлены выявы лермантаўскіх мясцін на Пензенскай зямлі. Мы ж плануем павезці ў Тарханы тэматычную выставу, прымеркаваную да 130-годдзя з дня нараджэння Я. Коласа.



Якуб Колас і Максім Лужанін у Мікалаеўшчыне. Апошні прыезд народнага паэта на радзіму. Красавік, 1956 год

**– Зінаіда Мікалаеўна, а што з задуманага ў справе папулярызацыі імя і творчай спадчыны Якуба Коласа пакуль зрабіць не ўдаецца і чаму?**

– Ведаеце, калі б усё ішло гладка і без праблем, то, магчыма, не цікава было б працаваць. Так у любой справе, і ў Коласазнаўстве – таксама. Шмат пра што мы проста марым. Штосьці плануем на бліжэйшую перспектыву, штосьці хочам зрабіць неадкладна. Не ўсё і не заўсёды атрымліваецца. Але праходзіць час і тое-сёе з задуманага ўвасабляецца ў жыццё.

Аднак з даўніх нашых мар пакуль далей планаў, прычым узгодненых на высокім узроўні, не пайшла справа па аднаўленні ў вёсцы Мікалаеўшчына, дзе ў свой час жыла сям'я народнага паэта, былой карчмы. Напэўна, і вам даводзілася ад многіх чуць сцверджанне, што Мікалаеўшчына – родная вёска Якуба Коласа. Гэта так і не так. З гэтага паселішча карані паэта, у мясцовым чатырохкласным вучылішчы ён атрымліваў пачатковую адукацыю, там жылі яго сваякі, сябры і прататыпы некаторых герояў твораў. Я. Колас спрыяў сваім землякам аднаўляць вёску пасля пажару 1940 года, для іх дзяцей

ён дапамог пабудаваць школу, якая сёння носіць яго імя... А ўдзячныя нашчадкі, у сваю чаргу, паставілі ў вёсцы помнік народнаму Песняру. А калі б увасобілася ідэя аднаўлення мікалаеўскай карчмы, з якой мы выступалі яшчэ напрыканцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя, то цяпер бы ў Мікалаеўшчыне існаваў выдатны турыстычны аб'ект.

Незаслужана доўга, як мне здаецца, ідзе праца над стварэннем энцыклапедыі «Якуб Колас». Аднатыпнае выданне, прысвечанае Янку Купалу, выйшла яшчэ ў 1986 годзе. Летась да чытача прыйшоў энцыклапедычны даведнік «Максім Багдановіч». Маем мы такі ж фаліянт пра Францыска Скарыну. Хацелася б, каб у бліжэйшыя год-два ўсё ж з'явілася і Коласаўская энцыклапедыя, праца над якой, між іншым, была распачата яшчэ ў 80-я гады мінулага стагоддзя.

Пакуль не атрымліваецца зрушыць з месца і справу па стварэнні скульптурнай кампазіцыі «Якуб Колас. Роздум», якую планавалася ўсталяваць да 130-годдзя народнага паэта на яго мемарыяльнай сядзібе ў Мінску. Дабрачынным саветам пры нашым музеі, які ўзначальвае А.В. Грэкаў, праводзіцца значная работа па зборы сродкаў для гэтых мэт. Зрабіць фінансавы ўнёсак у гэтую пачэсную справу абяцала і Міністэрства культуры. Але пакуль сабраных грошай недастаткова для пачатку нават праектных работ.

Можна, вядома, і яшчэ паразважаць у гэтым накірунку. Абы яно было на карысць справе...

**– І ўсё ж не хацелася б на сумнай ноце завяршаць нашу гаворку. Нельга, напрыклад, не заўважыць той факт, што будынак Коласавага музея сёння знаходзіцца ў рыштаваннях, ідзе яго рэстаўрацыя...**

– Так, гэта прыемная навіна. І яна з разраду доўгачаканых. Але нарэшце дайшла чарга, Міністэрствам культуры на гэтыя мэты былі выдзелены неабходныя сродкі: як-ніяк, Коласаў дом не рамантаваўся практычна ніводнага разу.

Будынак, дзе цяпер месціцца музей, быў узведзены за дзяржаўны кошт у 1952 годзе да 70-гадовага юбілею Якуба Коласа і аформлены ў адпаведнасці з тагачасным грамадскім статусам яго гаспадара – народнага паэта, акадэміка, дэпутата... Аўтарам праекта Коласавага дома з'яўляецца архітэктар Георгій Заборскі, вядомы майстар «сталінскага ампіру», стылю, які панаваў у 50-я гады ў савецкай архітэктуры. Дарэчы, ён спраектаваў і першую частку галоўнага праспекта сталіцы, а таксама помнік на плошчы Перамогі.




Помнік Я. Коласу ў Мікалаеўшчыне

Свой пачатак наша музейная ўстанова бярэ ад жалобнай у беларускай літаратуры даты – смерці Якуба Коласа. Народны паэт Беларусі памёр 13 жніўня 1956 года ў сваім кабінеце за рабочым сталом. А ўжо 16 жніўня выйшла пастанова ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР аб стварэнні музея Песняра. Аднак у сярэдзіне 50-х гадоў мінулага стагоддзя, апроч самога пісьменніка, у Коласавым доме жылі яго дзеці і ўнукі, таму немагчыма было адразу пасля смерці класіка адкрыць у ім музей і, безумоўна, патрэбен быў час, каб падрыхтаваць экспазіцыю.

Першым збіральнікам рэліквій стаў сын Якуба Коласа заслужаны дзеяч культуры Беларусі Даніла Канстанцінавіч Міцкевіч, які быў і першым дырэктарам музея, больш за 20 гадоў яго ўзначальваў. Пасля таго як для родзічаў паэта было пабудавана непадалёк асобнае жыллё, на вызваленых плошчах у Коласавым доме была размешчана музейная экспазіцыя, якая ўпершыню паўстала перад наведвальнікамі 4 снежня 1959 года. Якраз ад гэтай даты і адлічвае наш музей сваю гісторыю. Яго фонды на сённяшні дзень маюць амаль 40 тысяч адзінак захоўвання.

Цяперашняя экспазіцыя, храналагічна чацвёртая па ліку, была падрыхтавана да 120-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа. Яна ў многім наватарская па стылістыцы, крэатыўная па дызайну. Аднак гэта не значыць, што яна мае недатыкальны статус. Змяняюцца жыццёвыя рэаліі, як і ацэнкі пэўных грамадска-палітычных і літаратурна-мастацкіх з'яў, у тым ліку і знакавых з пункту погляду нацыянальнай ідэі твораў Якуба Коласа. Таму пэўная частка экспазіцыйнага поля абнаўляецца. Да таго ж, у музеі пастаянна працуюць зменныя выставы, на якіх паказваюцца як рэдкія экспанаты з запаснога фонду нашай установы, так і матэрыялы, прадстаўленыя іншымі музеямі, у тым ліку і замежнымі. Так што запрашаем наведаць Коласаў музей. У нас заўсёды цікава.

**Гутарыў Сяргей ГАЛОЎКА**